# ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ НАСЕЛЬНІЦТВА РЭГІЁНАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ПРАБЛЕМЫ ЯЕ КОЛЬКАСНАЙ АЦЭНКІ

**В.М. Сасноўскі,**
*кандыдат геаграфічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта*

Павышэнне якасці жыцця насельніцтва з'яўляецца рэальнай і вельмі важнай праблемай сучаснага развіцця ўсіх краін свету. Тэрмін «якасць жыцця» – адносна новы, ён з'явіўся ў ЗША прыкладна ў сярэдзіне XX ст., калі стала відавочным, што паняцце «ўзровень жыцця» не можа адлюстраваць усе тыя негатыўныя тэндэнцыі ў жыцці людзей, якія былі выкліканы пагаршэннем навакольнага прыроднага асяроддзя, ускладненнем дэмаграфічнага развіцця, абвастрэннем сітуацыі на рынку працы і інш.

Савецкая эканамічная і сацыялагічная навука ставілася да паняцця «якасць жыцця» больш чым асцярожна. У розных энцыклапедычных даведніках яно, як правіла, адсутнічала, а калі і было прадстаўлена, дык з крытычным падтэкстам як з`ява, характэрная для буржуазнай сацыялогіі. Для навукоўцаў савецкай школы таго часу (І.В. Бястужаў-Лада, І.Т. Лявыкін, В.Ф. Маер, В.М. Рутгайзер, Н.М. Рымашэўская, М.П. Федарэнка і інш.) больш характэрнымі з'яўляліся паняцці «дабрабыт народа», «узровень жыцця», «лад жыцця», «умовы жыцця», таму што яны вынікалі з галоўнай мэты развіцця краіны таго перыяду: забяспячэнне поўнага дабрабыту ўсіх яе членаў, фарміраванне новай гістарычнай супольнасці «савецкі народ», для якога быў характэрны «сацыялістычны лад жыцця».

У апошнія гады да праблемы якасці жыцця насельніцтва звяртаецца ўсё больш расійскіх навукоўцаў і даследчыкаў [2; 3; 5; 8; 9]. Цікавая работа па ацэнцы чалавечага патэнцыялу рэгіёнаў выканана ў апошнія гады даследчыкамі Украіны [10]. Пэўны вопыт у даследаванні катэгорый «узровень жыцця», «якасць жыцця», «якасць насельніцтва» назапашаны і навукоўцамі Рэспублікі Беларусь [1; 4; 6; 7].

Тым не менш даводзіцца канстатаваць, што адзінага, агульнапрынятага азначэння паняцця «якасць жыцця» яшчэ няма, як і няма агульных паказчыкаў яе вымярэння. У сувязі з гэтым узнікае пытанне аб тым, ці не занадта шмат часу трацяць даследчыкі на выяўленне суадносін розных, але блізкіх паняццяў: узровень жыцця, якасць жыцця, стыль жыцця, умовы жыцця, бяспека жыцця, лад жыцця і інш. У канчатковым выніку, як бы мы ні казалі, размова ўсё роўна ідзе пра жыццё насельніцтва і галоўнай застаецца праблема яго працягласці. Менавіта працягласць жыцця з`яўляецца тым фокусам, у якім знаходзяць сваё адлюстраванне ўсе вышэйпералічаныя бакі жыцця.

Мяжой падзелу паміж імі павінны выступаць перш за ўсё маштабы тэрыторыі, на якой даследуецца жыццё насельніцтва. Так, калі гэта жыццё насельніцтва адной краіны, часцей за ўсё даводзіцца гаварыць пра яго ўзровень ці якасць. Калі ж аб'ект вывучэння – жыццё людзей розных краін (ці рэгіёнаў свету), мы адзначаем не толькі ўзровень і якасць жыцця, але і лад жыцця, стыль жыцця. Апошнія два паняцці з'яўляюцца прыдатнымі пры выяўленні адрозненняў у жыцці людзей сельскай і гарадской мясцовасці, а таксама пры вывучэнні жыцця насельніцтва розных тыпаў гарадскіх пасяленняў. Аднак нам уяўляецца, што працягласць жыцця ў найбольшай ступені залежыць ад якасці жыцця. Мэта развіцця любой краіны павінна зводзіцца да таго, каб стварыць спрыяльныя ўмовы для працяглага жыцця яе людзей, каб гэта жыццё было здаровым і напоўненым творчасцю.

Якасць – філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае істотную вызначанасць аб“екта, дзякуючы якой ён з'яўляецца менавіта такім, а не іншым. Якасць жыцця ў адносінах да насельніцтва, на нашу думку, гэта, перш за ўсё, задаволенасць ці незадаволенасць сваім жыццём з пункту погляду розных патрэбнасцей і інтарэсаў, гэта тыя знешнія ўмовы існавання, якія ўплываюць на паводзіны і ў канчатковым

выніку – на працягласць жыцця. Мы бачым, што якасць жыцця – даволі складаная катэгорыя; яна, як і якасць іншых аб'ектаў (прадукцыі, насельніцтва, паветра і інш.), бывае рознай, таму патрабуе дасканалага вывучэння ў тэарэтычным, а таксама практычным плане. Пры гэтым магчымы розныя падыходы ў яе даследаванні: ад філасофска-светапоглядных да фармальна-статыстычных. У эканамічнай навуцы дадзеная катэгорыя мае ўласнае азначэнне і вымярэнне. Аднак каштоўнасць даследавання і яго глыбіня будуць тым большымі, чым большым будзе іх перапляценне, чым большую колькасць пунктаў сутыкнення можна будзе знайсці. Наяўнасць такой разнастайнай інфармацыі аб якасці жыцця насельніцтва з'яўляецца вельмі неабходнай, таму што ад яе залежаць правільнасць прымаемых рашэнняў і фарміраванне сістэмы сацыяльных стандартаў. Без такіх стандартаў складана ажыццяўляць кіраванне якасцю жыцця насельніцтва як на дзяржаўным, так і на рэгіянальным узроўнях. Спроба забяспечыць пераход да мадэлі сацыяльнай дзяржавы толькі шляхам павялічэння тэмпаў эканамічнага росту наўрад ці можа завяршыцца поспехам, бо сам па сабе эканамічны рост не змяняе прапорцый размеркавання валавога ўнутранага прадукту. Гэты вывад пацвярджаецца тым, што ў апошнія гады адносна высокія тэмпы эканамічнага росту як усёй Беларусі, так і яе рэгіёнаў, па сутнасці, не прывялі да істотнага павышэння сацыяльных расходаў і паляпшэння якасці жыцця насельніцтва. Змяніць сітуацыю магчыма толькі шляхам уключэння параметраў якасці жыцця ў лік прыярытэтных пры размеркаванні нацыянальнага даходу краіны.

Першы лагічны крок на шляху распрацоўкі сацыяльных стандартаў – вызначэнне тых элементаў, з якіх складаецца сама сістэма «якасць жыцця насельніцтва». Па нашаму меркаванню, гэта сістэма павінна складацца з васьмі элементаў (рыс. 1). Пры іх вызначэнні мы зыходзілі, па-першае, з таго, што немагчыма адлюстраваць стан такой складанай сістэмы праз абмежаваную колькасць элементаў, па-другое, чым большая колькасць элементаў будзе ўключана ў яе, тым большай паўнатой яна будзе характарызавацца.

Што датычыцца дакладных паказчыкаў па тых ці іншых элементах сістэмы «якасць жыцця насельніцтва», то тут мы сутыкаемся не толькі з вялікімі складанасцямі ў іх пошуку, але і з пэўнымі цяжкасцямі ў іх адборы (якія павінны быць паказчыкі і колькі). Менавіта ад гэтага будзе залежаць колькаснае адлюстраванне якасці жыцця. І тут нельга забываць пра тое, што ўяўленні кожнага чалавека аб якасці жыцця даволі суб'ектыўныя і лепш саміх «спажыўцоў» прасторы ніхто ніколі не ацэніць тэрыторыю іх існавання. Напрыклад, тое, што для сельскага жыхара з'яўляецца «марай усяго жыцця», жыхаром горада можа ўспрымацца як «звычайная каштоўнасць». Такія ж адрозненні ў прыярытэтах характэрны і для насельніцтва розных узростаў, розных сацыяльных груп. Усё разам дае падставы меркаваць пра абавязковасць сацыялагічных апытанняў пры вывучэнні такой складанай з'явы, як якасць жыцця.

У сувязі са сказаным важна звярнуць ўвагу на тое, што наўрад ці можна лічыць крытэрыем аб'ектыўнай ацэнкі якасці жыцця навуковыя нарматывы патрэбнасцей і інтарэсаў людзей [4. С. 41]. Тым не менш гэта ні ў якім разе не азначае адмаўлення ад тых афіцыйных звестак, якія назапашаны сусветнай і айчыннай статыстыкай. Факты заўсёды былі і застануцца падмуркам навукі. Іншая справа, што ў айчыннай статыстыцы можна знайсці абмежаваную колькасць паказчыкаў, якія ў той ці іншай ступені характарызуюць якасць жыцця насельніц-




Рыс. 1. Элементы сістэмы «якасць жыцця насельніцтва».

тва. Асабліва праблематычным з'яўляецца пошук такіх паказчыкаў на рэгіянальным узроўні, і перш за ўсё – на ўзроўні адміністрацыйных раёнаў. Нават пасля выхаду статыстычнага зборніка «Рэгіёны Рэспублікі Беларусь» сітуацыя істотна не змянілася. Яшчэ больш складаным уяўляецца спалучэнне аб'ектыўных статыстычных паказчыкаў і суб'ектыўных меркаванняў, атрыманых у ходзе сацыялагічных апытанняў. Такім чынам, праблем на шляху аб'ектыўнай ацэнкі жыцця насельніцтва не менш, чым праблем у самім жыцці.

Пры вызначэнні паказчыкаў якасці жыцця мы зыходзім, па-першае, з іх даступнасці, па-другое, з таго, наколькі поўна яны адлюстроўваюць тыя ці іншыя яго элементы, па-трэцяе, з роўнай іх колькасці. Пры гэтым усе паказчыкі з'яўляюцца адноснымі і, як правіла, сярэднімі за некалькі гадоў.

Для характарыстыкі такога элемента якасці жыцця, як дабрабыт, былі ўзяты: налічаная сярэднемесячная заработная плата работнікаў адносна мінімальнага спажывецкага бюджэту; забяспечанасць насельніцтва жыллём; узровень добраўпарадкаванасці жылля (абсталяванне жыллёвага фонду гарачым водазабеспячэннем, водаправодам і інш.); забяспечанасць насельніцтва прыватнымі легкавымі аўтамабілямі; рознічны тавараабарот і аб'ём платных паслуг у разліку на аднаго чалавека.

Бяспека насельніцтва характарызавалася праз такія паказчыкі, як узровень зарэгістраванай злачыннасці; удзельная вага проб гатовых прадуктаў харчавання, якая не адпавядае нарматыўна-тэхнічным дакументам; доля рабочых месцаў на прамысловых прадпрыемствах, якая не адпавядае санітарным нормам па фізічных фактарах (шум, асветленасць, метэафактары); удзельная вага проб вады, якая не адпавядае гігіенічным патрабаванням (па санітарна-хімічных паказчыках); доля проб прадуктаў харчавання і пітной вады з перавышэннем радыяцыйна дапушчальных узроўняў.

У якасці паказчыкаў, што характарызуюць дэмаграфічныя працэсы і здароўе насельніцтва, разглядаліся: узровень дэпапуляцыі (адносіны колькасці народжаных да колькасці тых, хто памёр); узровень смяротнасці немаўлят; колькасць інвалідаў у разліку на 1000 чалавек насельніцтва; забяспечанасць насельніцтва ўрачамі ўсіх спецыяльнасцей; забяспечанасць насельніцтва бальнічнымі ложкамі.

Сістэма паказчыкаў, якія характарызуюць прыродныя ўмовы, уключала ў сябе: забяспечанасць насельніцтва зямельнай плошчай; забяспечанасць насельніцтва ляснымі ўгоддзямі; сярэдняе ўтрыманне гумусу на ворных землях; суму актыўных тэмператур паветра вышэй 10 °С; кантынентальнасць клімату (адносіны гадавой амплітуды тэмператур паветра да паказчыка шырыні мясцовасці, памножанага на 0,33).

Экалагічныя ўмовы характарызаваліся праз наступныя паказчыкі: аб'ём назапашаных адходаў у разліку на адзінку плошчы; аб'ём выкідаў шкодных рэчываў у атмасфернае паветра ў разліку на адзінку плошчы; аб'ём скідаў сцёкавых вод у разліку на адзінку плошчы; доля насельніцтва, якая пражывае на тэрыторыі, забруджанай радыёнуклідамі; узровень запаведвання тэрыторыі (адносіны плошчы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і аб'ектаў да агульнай плошчы рэгіёна).

Да паказчыкаў сацыяльнай абароненасці былі аднесены: узровень зарэгістраванага беспрацоўя; сярэднедушавыя расходы раённых і гарадскіх бюджэтаў на ахову здароўя, адукацыю, культуру і сацыяльную дапамогу; узровень пенсій адносна мінімальнага спажывецкага бюджэту; колькасць працуючых пенсіянераў адносна ўсіх пенсіянераў, якія знаходзяцца на ўліку ў органах сацыяльнай абароны; узровень самагубстваў.

У якасці паказчыкаў, што характарызуюць самарэалізацыю, былі выкарыстаны: удзельная вага школ з беларускай мовай навучання ў агульнай колькасці дзённых агульнаадукацыйных школ; колькасць асоб з вышэйшай адукацыей у разліку на 10 тыс.чалавек насельніцтва; колькасць грамадзян, якія выехалі на пастаяннае месца жыхарства за межы рэгіёна, у разліку на 10 тыс. чалавек насельніцтва; колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на адну вакантную пасаду на прадпрыемствах і ў арганізацыях; каэфіцыент нараджальнасці ў жанчын дзетароднага ўзросту.

Для характарыстыкі такога элемента якасці жыцця, як свабода, былі выкарыстаны: агульны тыраж дзяржаўных і недзяржаўных раённых газет у разліку на 1000 чалавек насельніцтва; забяспечанасць насельніцтва культавымі ўстановамі; колькасць зваротаў у суды ў разліку на 10 тыс. чалавек насельніцтва; колькасць грамадскіх арганізацый у разліку на 10 тыс. чалавек насельніцтва; доля занятых у

агульнай колькасці насельніцтва працаздольнага ўзросту.

Зразумела, што толькі гэтымі паказчыкамі не вычэрпваецца магчымасць адлюстравання элементаў якасці жыцця насельніцтва. Існуюць такія яе бакі, якія колькасна ахарактарызаваць даволі праблематычна ці ўвогуле немагчыма (напрыклад, упэўненасць у будучыні, задаволенасць сваёй працай, надзейнасць сяброў і інш.). Менавіта тут «на дапамогу» і павінны прыйсці сацыялагічныя апытанні.

Не бясспрэчным, на нашу думку, з'яўляецца аднясенне некаторых паказчыкаў да тых ці іншых элементаў. Так, доля насельніцтва, якая пражывае на радыяцыйна-забруджанай тэрыторыі, намі ўключана ў такі элемент якасці жыцця, як экалагічныя ўмовы. Аднак гэты паказчык мог бы быць у роўнай ступені аднесены да элемента «бяспека». Ці, напрыклад, узровень самагубстваў. Вядома, што ён адлюстроўвае ў пэўнай ступені такія элементы, як «здароўе насельніцтва», «самарэалізацыя». У нас жа гэты паказчык знаходзіцца ў сістэме «сацыяльная абароненасць». Галоўнае, па нашаму меркаванню, тое, што гэтыя паказчыкі «прысутнічаюць» пры характарыстыцы якасці жыцця, а да якога элемента яны аднесены, пытанне важнае, але ў дадзеным выпадку другараднае.

Наступны важны крок на шляху вывучэння якасці жыцця насельніцтва і вызначэння сацыяльных стандартаў – сумарная ацэнка ўсіх элементаў якасці жыцця. Улічваючы тое, што для кожнага чалавека, незалежна ад месца яго пражывання, важнымі ўяўляюцца ўсе яе элементы, мы зыходзім з таго, што кожны элемент у гэтай ацэнцы павінен знайсці сваё адлюстраванне, а колькасць паказчыкаў па кожнаму з іх з'яўляецца аднолькавай. Роўная колькасць паказчыкаў не толькі сведчыць аб аднолькавай важнасці разглядаемых параметраў, але і спрашчае далейшыя разлікі.

Мы сабралі інфармацыю і правялі разлікі па ўсіх пяці паказчыках і па кожнаму з разглядаемых элементаў у разрэзе адміністрацыйных раёнаў Мінскай вобласці. Затым усе раёны былі праранжыраваны па ўсіх гэтых паказчыках (у нас іх 40), вызначаны сярэдні ранг па кожнаму элементу і знойдзена сума рангаў, ці інтэгральны паказчык для кожнага раёна. У выніку, чым меншая сума рангаў, тым больш высокай якасцю жыцця характарызуецца раён. Дастаткова адначыць, што ў межах Мінскай вобласці розніца паміж раёнамі як па асобных элементах якасці жыцця, так і па іх сукупнасці дасягае істотнай велічыні (гл. табл.). Пры гэтым цікава падкрэсліць, што нават у межах адной вобласці можна заўважыць пэўныя геаграфічныя заканамернасці (рыс. 2).

Зразумела, што такія разлікі можна ажыццявіць па ўсіх абласцях краіны і вызначыць «лепшы» раён. Менавіта яго параметры могуць і павінны разглядацца ў якасці «эталоннага» для вызначэння дзяржаўных стандартаў як па ўсёй сукупнасці элементаў якасці жыцця, так і па асобных іх відах. Нельга забывацца пра тое, што дзяржава, ці нацыянальная эканамічная прастора, складаецца з рэгіёнаў, і няма нічога дзіўнага ў тым, што лепшыя параметры якасці жыцця пэўнага рэгіёна з'яўляюцца арыентырам для ўсіх астатніх. «Для грамадзян важна, калі дасягае росквіту ўся краіна, а не асобныя яе часткі», – пісаў Сенэка.

Пытанне аб тым, чаму менавіта прасторавы ўзровень (у нас гэта адміністрацыйны раён)




Рыс. 2. Інтэгральны паказчык якасці жыцця насельніцтва адміністрацыйных раёнаў Мінскай вобласці (Мінскі раён без г. Мінска).

**Сярэднія рангі асобных элементаў якасці жыцця насельніцтва адміністрацыйных раёнаў Мінскай вобласці ў 2001 г.**

| Раён | Дэмаграфічныя працэсы і здароўе насельніцтва | Прыродныя ўмовы | Экалагічныя ўмовы | Бяспека | Дабрабыт | Сацыяльная абароненасць | Свабода | Самарэа-лізацыя | Сума рангаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бярэзінскі | 16,0 | 9,6 | 9,8 | 11,4 | 16,6 | 13,4 | 17,0 | 12,4 | 106,2 |
| Барысаўскі | 9,2 | 13,0 | 14,0 | 15,6 | 10,4 | 12,2 | 13,6 | 14,2 | 102,2 |
| Вілейскі | 6,2 | 12,6 | 12,0 | 13,2 | 15,2 | 13,6 | 13,4 | 7,8 | 94,0 |
| Валожынскі | 15,0 | 12,4 | 11,4 | 11,4 | 16,0 | 12,6 | 9,8 | 15,4 | 104,0 |
| Дзяржынскі | 9,8 | 13,6 | 11,4 | 9,6 | 7,2 | 10,8 | 16,4 | 5,0 | 83,8 |
| Клецкі | 12,8 | 9,6 | 7,6 | 5,6 | 11,8 | 15,6 | 6,4 | 16,2 | 85,6 |
| Капыльскі | 15,6 | 11,4 | 7,6 | 8,2 | 12,2 | 8,6 | 10,2 | 14,2 | 88,0 |
| Крупскі | 14,2 | 10,4 | 7,4 | 12,0 | 14,8 | 8,8 | 11,4 | 15,8 | 94,8 |
| Лагойскі | 14,6 | 9,0 | 9,4 | 8,6 | 16,8 | 14,8 | 14,8 | 8,8 | 96,8 |
| Любанскі | 13,2 | 6,4 | 11,0 | 15,4 | 19,0 | 9,4 | 14,8 | 11,2 | 100,4 |
| Мінскі | 2,6 | 15,6 | 11,2 | 14,4 | 5,0 | 11,4 | 10,2 | 8,8 | 79,2 |
| Маладзечанскі | 6,2 | 14,0 | 17,0 | 12,8 | 5,6 | 14,2 | 10,4 | 13,2 | 93,4 |
| Мядзельскі | 9,0 | 10,2 | 4,6 | 9,0 | 9,2 | 15,0 | 7,4 | 11,4 | 75,8 |
| Нясвіжскі | 11,8 | 16,4 | 14,0 | 6,4 | 6,4 | 10,4 | 9,4 | 7,2 | 82,0 |
| Пухавіцкі | 12,6 | 12,6 | 10,6 | 13,0 | 12,0 | 15,6 | 14,0 | 8,8 | 99,2 |
| Слуцкі | 8,8 | 11,6 | 16,2 | 10,4 | 9,0 | 8,6 | 10,4 | 15,4 | 90,4 |
| Смалявіцкі | 8,8 | 12,6 | 11,8 | 15,4 | 8,8 | 8,4 | 13,6 | 12,0 | 91,4 |
| Салігорскі | 6,2 | 11,0 | 17,2 | 15,8 | 6,0 | 11,4 | 9,6 | 15,2 | 92,4 |
| Старадарожскі | 14,6 | 8,8 | 5,6 | 15,8 | 17,0 | 8,6 | 12,0 | 11,8 | 94,2 |
| Стаўбцоўскі | 15,2 | 10,8 | 11,6 | 8,8 | 9,4 | 12,2 | 7,4 | 6,4 | 81,8 |
| Уздзенскі | 13,2 | 10,0 | 6,2 | 7,2 | 10,0 | 6,4 | 11,2 | 8,8 | 73,0 |
| Чэрвеньскі | 17,4 | 11,4 | 9,8 | 13,0 | 14,6 | 11,0 | 13,0 | 13,0 | 103,2 |

выбраны намі за асноўны, тлумачыцца наступным. Па-першае, вызначаныя намі элементы якасці жыцця маюць перш за ўсё прасторавую «прывязку». Жыццё людзей не абмяжоўваецца іх домам ці кватэрай, яно заўсёды звязана з прасторай. За рэдкім выключэннем гэта прастора вымяраецца некалькімі сотнямі квадратных кіламетраў, што адпавядае плошчы звычайнага адміністрацыйнага раёна Беларусі. Па-другое, паляпшэнне сярэдніх параметраў якасці жыцця насельніцтва краіны можа адбывацца за кошт невялікай колькасці буйных гарадоў ці асобных адміністрацыйных раёнаў, тады як для большай іх часткі яго можа не быць увогуле. Пры такой «палярызацыі» павышэння якасці жыцця няма ніякіх падстаў казаць пра гэта павышэнне ва ўсёй краіне. Зусім іншая сітуацыя ўзнікае, калі паляпшэнне назіраецца ва ўсіх раёнах і гарадах. Па-трэцяе, менавіта адміністрацыйныя раёны застаюцца адным з галоўных звёнаў у сістэме рэгіянальнага кіравання. Гэта той узровень, на якім лепш адчуваецца «пульс жыцця» краіны. Ды і статыстычная справаздачнасць адыграла тут не апошнюю ролю.

Не выклікае сумненняў, што такая інфармацыя жыццёва неабходная ўсім тым, хто мае дачыненне да распрацоўкі новай Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця. Атрыманыя вынікі дазваляюць своечасова выявіць «балявыя» пункты ў жыцці насельніцтва рэгіёнаў і пры неабходнасці пераразмеркаваць сродкі з мэтай іх аслаблення.

Па аналогіі з прапанаванай методыкай можна вызначыць якасць жыцця насельніцтва і для краін свету. Галоўнае тут – аптымальны і дакладны адбор паказчыкаў і іх супастаўнасць. Разлічваемы ўжо некалькі гадоў для розных краін індэкс развіцця чалавечага патэнцыялу – важны і правільны крок у гэтым накірунку, аднак недастатковы. Не ўлічанымі застаюцца шматлікія бакі жыцця людзей, якія ў сённяшніх умовах патрабуюць да сябе пільнай увагі (узровень злачыннасці, палітычныя свабоды і інш.). Патрэбны ўсебаковы і комплексны падыход да вывучэння сістэмы «якасць жыцця насельніцтва», які дазволіць не толькі ўбачыць, «дзе лепш», але і адказаць на пытанне «чаму». Праўда, гэта не выключае імкнення да пошуку агульнага крытэрыю «цывілізаванасці» краін свету. Тут найбольш прымальным, на нашу думку, з'яўляецца паказчык сярэднедушавога спажывання энергіі. З ім карэліруюць, як правіла, іншыя паказчыкі ўзроўню і якасці жыцця. Аднак зноў жа – «рэгіянальныя цяжкасці». Гэты паказчык найбольш прыдатны для вызначэння якасці жыцця насельніцтва краін умеранага пояса. Ну а пра цяжкасці яго вымярэння на ўзроўні рэгіёнаў асобных краін і гаварыць не даводзіцца. Таму прапанаваны намі падыход да вызначэння сацыяльных стандартаў калі і не можа быць адразу рэалізаваны на практыцы, дык увагі да сябе заслугоўвае.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Айвазян С.А.* К проблеме измерения качества жизни (концепция, методология, информационно-статистическое обеспечение) // Анализ и моделирование компьютерных данных. Мн., 1998.

2. *Бобков В.Н., Масловский-Мстиславский П.С.* Качество жизни: концепция и измерение // Уровень жизни населения регионов России. 1998. № 12.

3. *Бочкарева В.К.* Интегральный показатель качества жизни // Народонаселение. 2001. № 3.

4. *Корж Г.Г.* Методологические подходы к определению понятий «уровень жизни» и «качество жизни» населения // Проблемы повышения уровня и качества жизни населения Республики Беларусь. Мн., 2002.

5. *Найданова С.Б.* Качество жизни населения Республики Бурятия в условиях реформ. Улан-Удэ, 1999.

6. *Потапова И.О.* Уровень жизни населения: содержание, формы и факторы роста. Мн., 2001.

7. *Рубин Я.И.* Уровень жизни, качество жизни, качество населения: к разграничению категорий // Социальная политика Республики Беларусь. Мн., 1997.

8. *Слуцкий Е.Т.* Качество жизни молодежи и молодежная политика. Санкт-Петербург, 1997.

9. *Стрижкова Л., Златоверховникова Т.* Качество жизни в российских регионах // Экономист. 2002. № 10.

10. *Людський розвиток регіонів України*: методика оцінки та сучасний стан. Київ, 2002.

■ ■ ■